**Са Справаздачнага даклада І. В. Сталіна на XVIII з'ездзе партыі аб рабоце ЦК ВКП(б). 10 сакавіка 1939 г.**

Кадры партыі — гэта камандны састаў партыі, а з той прычыны, што наша партыя знаходзіцца ва ўладзе, яны з'яўляюцца таксама камандным саставам кіроўных дзяржаўных органаў. Пасля таго як выпрацавана правільная палітычная лінія, правераная на практыцы, кадры партыі становяцца вырашальнай сілай партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва… Правільная палітычная лінія патрэбна не для дэкларацыі, а для ўкаранення ў жыццё. Але, каб ажыццявіць правільную палітычную лінію, патрэбны кадры, патрэбны людзі, якія разумеюць палітычную лінію партыі, якія ўспрымаюць яе як сваю ўласную лінію, гатовыя яе праводзіць, якія ўмеюць рэалізоўваць яе на практыцы і здольныя адказваць за яе, абараняць яе, змагацца за яе. Без гэтага правільная палітычная лінія рызыкуе застацца на паперы.



Выступленне І. В. Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП (б). Мастак *А. Герасімаў*. 1939 г.

*Якую ролю ў палітычнай сістэме Савецкага Саюза адыгрывала партыя бальшавікоў? Растлумачце, як адбывалася зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату.*

# § 14. Культурныя пераўтварэнні ў СССР

*1. Ахарактарызуйце сістэму адукацыі ў Расіі да Кастрычніцкай рэвалюцыі. 2. Назавіце адметныя рысы перыяду ў развіцці культуры Расіі, які атрымаў назву «срэбнае стагоддзе».*

Развіццё савецкай культуры насіла супярэчлівы характар. З аднаго боку, аб'ектыўна патрабавалася павысіць пісьменнасць насельніцтва, развіваць новыя напрамкі навукі, рыхтаваць кадры навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі ў адпаведнасці з задачамі будаўніцтва індустрыяльнага грамадства. З іншага боку, савецкая ўлада ставіла найважнейшай мэтай умацаванне свайго ідэалагічнага ўплыву ў грамадстве, актыўна выкарыстоўваючы для гэтага магчымасці літаратуры, мастацтва, грамадскіх навук. Рэвалюцыйныя падзеі падзялілі навуковую і творчую інтэлігенцыю на тых, хто адмовіўся супрацоўнічаць з савецкай уладай і пакінуў радзіму, і тых, хто, прыняўшы рэвалюцыю, удзельнічаў у стварэнні новай культуры. Культурныя пераўтварэнні, звязаныя з ліквідацыяй непісьменнасці, стварэннем новай савецкай школы, падрыхтоўкай кадраў «народнай інтэлігенцыі», развіццём навукі, літаратуры, мастацтва пад партыйным кантролем і на аснове марксісцка-ленінскай ідэалогіі, атрымалі назву «культурная рэвалюцыя».

**Ліквідацыя масавай непісьменнасці.** Праца па ліквідацыі непісьменнасці пачалася яшчэ ў гады Грамадзянскай вайны. Было створана Таварыства «Далоў непісьменнасць». У яго кіраўніцтва ўваходзілі выбітныя партыйныя дзеячы Савецкай дзяржавы.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Школа пісьменнасці. Кожны населены пункт, дзе было звыш 15 непісьменных, павінен быў мець школу пісьменнасці (лікпункт)



Знакаміты савецкі педагог А. С. Макаранка з выхаванцамі. Адыграў вялікую ролю ў барацьбе з дзіцячай беспрытульнасцю ў 1920-я гг. Праз камуны, арганізаваныя А. С. Макаранкам, прайшло больш за 3 тыс. беспрытульнікаў

*Высветліце, чаму А. С. Макаранку называюць выбітным педагогам, эфектыўным кіраўніком, а дзейнасць яго камун разглядаюць як паспяховы бізнес-праект.*

Па ўсёй краіне былі адкрыты тысячы школ і пунктаў па навучанні грамаце. Чытанню, лічэнню, пісьму навучалі як дзяцей, так і дарослых. Барацьба за ліквідацыю непісьменнасці дала ўражальны вынік. Да пачатку 1939 г. 80 % насельніцтва СССР умелі чытаць, пісаць і лічыць.

**Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі.** Рэарганізацыя сістэмы народнай адукацыі пачалася ў верасні 1918 г. Адмянялася плата за навучанне, была створана адзіная працоўная школа, якая складалася з дзвюх ступеняў: для дзяцей ад 8 да 13 гадоў і для падлеткаў ад 13 да 17 гадоў. Важную ролю ў падрыхтоўцы рабоча-сялянскай моладзі да навучання ў ВНУ адыгралі *рабочыя факультэты (рабфакі)*. Першы рабфак быў адкрыты яшчэ ў 1919 г. Усё гэта прывяло да змены сацыяльнага складу студэнцтва і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

У 1930 г. была ўведзена абавязковая пачатковая адукацыя. У цэлым жа савецкая сістэма адукацыі аформілася да сярэдзіны 1930-х гг. Яна ўключала пачатковую, агульную, сярэднюю, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую школы. У даваенныя гады завяршыўся пераход да ўсеагульнай сямігадовай адукацыі. Навучанне праводзілася на аснове строгай дысцыпліны і раскладу. У школе вывучаліся гісторыя краіны, гуманітарныя і дакладныя навукі. Ідэалагічнае кіраванне ажыццяўлялі вопытныя партыйныя работнікі і камсамольцы.

Індустрыялізацыя патрабавала павелічэння колькасці дасведчаных спецыялістаў на вытворчасці. Таму ў 1933—1937 гг. для павышэння кваліфікацыі працоўных была створана сістэма рабочых школ і прафесійных курсаў. У СССР адкрываліся тэхнічныя і сельскагаспадарчыя вышэйшыя навучальныя

Правообладатель Издательский центр БГУ

Партрэт П. Л. Капіцы і М. М. Сямёнава. Мастак *Б. М. Кустодзіеў*. 1921 г.



*Высветліце, як склаўся лёс гэтых маладых навукоўцаў.*

ўстановы (ВНУ). У параўнанні з дарэвалюцыйным перыядам сетка ВНУ вырасла больш чым у 8 разоў і склала 817 універсітэтаў і інстытутаў. Колькасць спецыялістаў павялічылася з 1,5 млн чалавек у 1917 г. да 20 млн у 1941 г.

**Навуковыя адкрыцці.** Дзяржава выдаткоўвала велізарныя сродкі на развіццё навуковых даследаванняў. У выніку важныя адкрыцці былі зробленыя ў вывучэнні атамнага ядра (акадэмік *А. Ф. Ёфе*), распрацоўцы тэорыі касмічных палётаў *(К. Э. Цыялкоўскі)*, тэорыі рэактыўнага руху *(Ф. А. Цандэр)*. Вялікі ўнёсак у вывучэнне Паўночнага марскога шляху зрабілі *О. Ю. Шміт* і *І. Д. Папанін*. Сусветнае прызнанне атрымалі даследаванні выдатных вучоных *І. П. Паўлава* ў галіне фізіялогіі, *М. І. Вавілава* — генетыкі, *У. І. Вярнадскага* — біясферы. Працы *М. Я. Жукоўскага* ляглі ў аснову самалётабудавання. Прарыў савецкіх спецыялістаў у справе авія- і ракетабудавання звязаны з імёнамі *А. М. Тупалева* і *С. П. Каралёва*.

У той жа час многія навукоўцы, якія не жадалі мірыцца з новым палітычным рэжымам, пакінулі краіну ў гады Грамадзянскай вайны. Сярод іх былі выбітныя дарэвалюцыйныя вучоныя-гуманітарыі *П. Сарокін, М. А. Бярдзяеў, М. А. Лоскі*. Многіх з тых, хто застаўся, рэпрэсавалі (*А. Ф. Лосева, П. А. Фларэнскага* і інш.).

№ 12

**Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва.** У 1920-я гг. захоўвалася характэрная для «срэбнага стагоддзя» разнастайнасць літаратурных груповак, мастацкіх аб'яднанняў, стылявых і жанравых кірункаў у мастацтве.

З сярэдзіны 1930-х гг. пачаўся новы этап у развіцці мастацкай культуры. Афіцыйным і адзіным мастацкім прынцыпам стаў метад *сацыялістычнага рэалізму (сацрэалізм)*. Ён прадугледжваў, што творы літаратуры і мастацтва павінны ўслаўляць сацыялістычнае будаўніцтва і разглядаць навакольную рэчаіснасць праз прызму барацьбы за сацыялізм.



*К. Малевіч.* Скача чырвоная конніца. 1928—1932 гг.

У літаратуры 1930-х гг. побач з імёнамі, вядомымі да рэвалюцыі (*М. Горкі, А. Талстой* і інш.), з'явіліся новыя — *М. Шолахава* («Ціхі

Правообладатель Издательский центр БГУ



*А. Дайнека.* Знатныя людзі краіны Саветаў. Пано для павільёна СССР на Сусветнай выставе ў Парыжы. 1937 г.

Дон»), *М. Шагінян* («Гідрацэнтраль»), *В. Катаева* («Час, наперад!»), пісьменнікаў-сатырыкаў *І. Ільфа* і *Я. Пятрова* («Дванаццаць крэслаў», «Залатое цяля»). Сфарміравалася савецкая дзіцячая літаратура *(С. Маршак, К. Чукоўскі, А. Гайдар, Б. Жыткоў)*.

Для выяўленчага мастацтва былі характэрны парадны жывапіс і работы, прысвечаныя рэвалюцыі і Грамадзянскай вайне, будаўніцтву сацыялізму *(С. Герасімаў, К. Пятроў-Водкін, А. Дайнека, М. Грэкаў)*.

У гэтым жа кірунку развіваўся і кінематограф, якому надавалася асаблівая ўвага. Галоўнымі тэмамі кіно былі жыццё савецкіх людзей і іх удзел у рэвалюцыйных падзеях («Браняносец „Пацёмкін“», «Кастрычнік» *С. Эйзенштэйна*, «Ленін у Кастрычніку» і «Ленін у 1918 г.» *М. Рома*), Грамадзянскай вайне («Мы з Кранштата» *Я. Дзігана*, «Чапаеў» *С.* і *Р. Васільевых*), індустрыялізацыі і калектывізацыі («Сямёра смелых» і «Камсамольск» *С. Герасімава*). Многія члены ЦК ВКП (б), у тым ліку І. В. Сталін, асабіста праглядалі фільмы і былі іх цэнзарамі. Шэраг мастацкіх твораў так і не дайшоў да чытача і гледача (раманы *М. Булгакава* і *А. Платонава*, карціны *К. Малевіча* і інш.).

**Сацыялістычная дзяржава і царква.** Дарэвалюцыйная Расія была выключна рэлігійнай краінай. Рэлігія і царква істотна ўплывалі на ўсе пласты насельніцтва. Гэта стала адной з прычын жорсткага ціску бальшавікоў на *Рускую Праваслаўную Царкву (РПЦ)*. Бо ў яе асобе яны бачылі свайго «ідэалагічнага канкурэнта». Барацьбу з рэлігіяй бальшавікі разглядалі як частку свайго асветніцкага абавязку.

Сувязь часоў



Храм Хрыста Збавіцеля, пабудаваны ў гонар перамогі і ў памяць аб тых, хто загінуў у Айчынная вайне 1812 г. Быў разбураны 5 снежня 1931 г. Адноўлены ў 1990-я гг.

З першых дзён савецкай улады дзяржава актыўна ўмешвалася ва ўнутраныя справы не толькі РПЦ, але і іншых рэлігій: ісламу, будызму і інш. Былі прынятыя рашэнні аб канфіскацыі маёмасці духоўных семінарый і акадэмій. Царкоўны шлюб ужо не прызнаваўся дзяржавай, святароў пазбавілі ўсіх відаў падтрымкі. *23 студзе-*

Правообладатель Издательский центр БГУ

*ня 1918 г.* убачыў свет дэкрэт аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы. РПЦ страціла сваю ранейшую ролю ў сістэме адукацыі.

Канстытуцыя РСФСР 1918 г. пазбавіла духавенства і манахаў права голасу як «непрацоўны элемент». Праваслаўныя святары і вернікі былі адной з найбольш значных катэгорый грамадзян, якія зазналі ціск і рэпрэсіі. ***Патрыярх Ціхан*** спрабаваў крытыкаваць новую ўладу. Гэта прывяло толькі да таго, што ўпершыню ў гісторыі РПЦ кіраўнік царквы быў аддадзены пад суд.

У перыяд калектывізацыі, якая суправаджалася сялянскімі хваляваннямі, пачалася новая хваля рэпрэсій у дачыненні духавенства і масавага закрыцця цэркваў. У чэрвені 1929 г. адбыўся II з'езд Саюза ваяўнічых бязбожнікаў (СВБ), які прыняў рашэнне наступную пяцігодку абвясціць «бязбожнай». У першы год планавалася закрыць усе духоўныя школы, у другі — правесці масавае закрыццё храмаў і забараніць выданне рэлігійнай літаратуры, у трэці — выслаць усіх служыцеляў культу за мяжу, у чацвёрты — зачыніць усе астатнія храмы ўсіх канфесій, у пяты — замацаваць дасягнутыя поспехі. СВБ наіўна меркаваў, што да 1 мая 1937 г. «імя бога павінна быць забыта на ўсёй тэрыторыі СССР».

З 1937 г. адзіным дзяржаўным органам, які займаўся справамі РПЦ, стаў спецыяльны аддзел Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС). Ён прылічаў «царкоўнікаў» да «антысавецкіх элементаў». Пачаліся масавыя арышты і расстрэлы святароў. У лепшы бок сітуацыя змянілася толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

1. Растлумачце значэнне паняцця «культурная рэвалюцыя». Чым была выклікана неабходнасць яе правядзення ў Савецкай Расіі? Вызначце станоўчыя і адмоўныя бакі культурных пераўтварэнняў, праведзеных у Савецкай дзяржаве.
2. Дакажыце, што да канца 1930-х гг. СССР стаў краінай з высокім узроўнем адукацыі.
3. Падрыхтуйце прэзентацыю «Дасягненні савецкай навукі ў міжваенны перыяд».
4. У чым выявілася адзяржаўленне навукі, адукацыі і мастацтва ў гады сацыялістычнага будаўніцтва?
5. Растлумачце значэнне паняцця «сацыялістычны рэалізм». Для адказу выкарыстайце ілюстрацыі раздзела і дакумент пасля параграфа.
6. Ахарактарызуйце палітыку ў дачыненні царквы, якую праводзіла Савецкая дзяржава. Якія наступствы для царквы і ў цэлым для грамадства мела гэтая палітыка?

1920-я гг. у галіне літаратуры і мастацтва ў Савецкай Расіі характарызаваліся разнастайнасцю мастацкіх і літаратурных аб'яднанняў і стыляў. Чаму да сярэдзіны 1930-х гг. яны спынілі сваё існаванне?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**З дэкларацыі Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыйнай Расіі. 1922 г.**

Наш грамадзянскі абавязак перад чалавецтвам — мастацка-дакументальнае адлюстраванне найвялікшага моманту гісторыі ў яго рэвалюцыйным парыве. Мы ўвасобім сённяшні дзень: побыт Чырвонай Арміі, побыт рабочых, сялянства, дзеячаў рэвалюцыі і герояў працы… Мы дадзім сапраўдную карціну падзей, а не абстрактныя выдумкі, якія дыскрэдытуюць нашу рэвалюцыю перад аблічам міжнароднага пралетарыяту.

*Чаго патрабавала ад мастака савецкая мастацкая дактрына? Якую мэту павінна было выконваць мастацтва ў савецкім грамадстве?*

## Абагульняльныя пытанні і заданні да раздзела II

**1.** Якія этапы ў гісторыі Савецкай дзяржавы можна вылучыць у міжваенны перыяд? Складзіце адпаведную схему.

**2.** Складзіце воблака тэгаў па тэме «Гісторыя Савецкай Расіі і СССР у 1918—1939 гг.».

**3.** Растлумачце прычынна-выніковую сувязь:




**4.** «Нікому ніколі не ўдасца паставіць пад сумнеў фатальную сувязь паміж 27 жніўня і 25 кастрычніка 1917 г.», — так пісаў у сваіх успамінах А. Ф. Керанскі. Што ж адбылося ў жніўні 1917-га?

**5.** Апішыце працэс фарміравання палітычнай сістэмы ў СССР. Якія фактары садзейнічалі ператварэнню СССР у цэнтралізаваную дзяржаву з камандна-адміністратыўнай сістэмай?

**6.** Якія этапы знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы ў міжваенны перыяд можна вылучыць? Пералічыце фактары, якія садзейнічалі змене напрамкаў знешняй палітыкі. Якія, на ваш погляд, дасягненні і пралікі знешнепалітычнай дзейнасці Савецкай дзяржавы?

**7.** Складзіце галерэю «Асобы эпохі: Савецкая Расія і СССР у 1918—1939 гг.».

**8.** Арганізуйце выставу рэпрадукцый твораў мастацтва (жывапісу, скульптуры, архітэктуры), створаных у Савецкай дзяржаве ў міжваенны перыяд. Які з іх найбольш вас уразіў? Растлумачце, чаму.

Правообладатель Издательский центр БГУ